Задача — падрыхтаваць да пенсіі...

КОЛЬКІ СЛОЎ АБ САЦЫЯЛЬНЫМ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВЕ

А гэтыя шляхі ёсць. Напрыклад, можна стварыць грамадскую арганізацыю, якая будзе займацца вырашэннем існуючых сацыяльных праблем ці пытанняў. Ці, калі ў чалавека ёсць прадпрымальніцкія здольнасці, ён можа стварыць камерцыйную структуру, якая аказвае, напрыклад, адукацыйныя паслугі або паслугі патранатнага догляду пажылых людзей.

Выбар з розных варыянтаў вырашэння праблемы — больш рэалістычны і дзейсны падыход, чым спадзяванне толькі на дзяржаву ці, калі кінуцца ў іншую крайнасць, толькі на сябе.

Апошнім часам ва ўсім свеце актыўна развіваецца сацыяльнае прадпрымальніцтва, якое нацэлена на бізнес-рашэнне сацыяльных праблем. Яно сапраўды можа быць добрым выйсцем у многіх сітуацыях, але большасць беларусаў да гэтага часу не вельмі добра ўяўляе сабе, што гэта такое. Мы вырашылі пагаварыць пра новы для нашага грамадства трэнд з **кіраўніком сталічнага Цэнтра сацыяльных праектаў Аленай КУЛЮКІНАЙ.**

Для пачатку — невялікая даведка. Цэнтр сацыяльных праектаў — гэта структурнае падраздзяленне ўнітарнага прадпрыемства «Баркос». Унітарным яно называецца таму, што ў яго ёсць адзіны заснавальнік — Беларускае таварыства інвалідаў. «Баркос» — гэта сацыяльнае прадпрыемства, створанае для таго, каб забяспечыць рабочыя месцы людзям з інваліднасцю. На ім працуюць 100 чалавек, і палова з іх мае інваліднасць, асноўная накіраванасць прадпрыемства — швейная вытворчасць.

Калі з'явілася магчымасць узяць у арэнду офіс у цэнтры горада, на прадпрыемстве вырашылі стварыць цэнтр, які будзе займацца рознымі сацыяльнымі праектамі.

Алену Кулюкіну запрасілі ў цэнтр пісаць праекты, праграмы, распрацоўваць кірункі, якія, апроч усяго іншага, павінны прынесці прадпрыемству прыбытак.

— Таму што мэта любога прадпрымальніцтва, у тым ліку і сацыяльнага, — гэта ўсё ж такі даход, — кажа Алена. — Што такое сацыяльнае прадпрымальніцтва? Мы трошкі няправільна ўспрымаем слова «сацыяльнае». Гэта не толькі неабароненыя пласты насельніцтва накшталт людзей з інваліднасцю, пенсіянераў і малазабяспечаных сем'яў. Слова «сацыяльнае» можна аднесці да любых людзей і да ўсяго, што нас акружае. Гэта тое, што мае дачыненне

да людзей, соцыуму і да нашага з вамі жыцця. Усё, што адносіцца да нашага вольнага часу, навучання, адраджэння культурных традыцый, — гэта «сацыяльнае». Таму, напрыклад, прыватныя курсы навучання здаровых падлеткаў сучасным танцам таксама можна назваць сацыяльным прадпрымальніцтвам. Але ўлічваючы тое, што ў гэтым раёне Мінска дзяцей мала, а большасць гараджан, якія тут пражываюць, знаходзяцца ў сталым узросце, Цэнтр сацыяльных праектаў арыентуецца ў першую чаргу на гэтую аўдыторыю.

РАБОЧАЯ НАЗВА — «ДАДАТКОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ 50+»...

Наогул, як лічыць наша суразмоўніца, дадатковая адукацыя людзей перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту ў нас яшчэ не вельмі развіта. «Ёсць Універсітэт трэцяга ўзросту ў Мінску і Універсітэт залатога ўзросту ў Гродне, нядаўна ў Мінску адкрыўся Цэнтр актыўнага даўгалецця, існуюць гурткі пры тэрытарыяльных цэнтрах сацабслугоўвання (ТЦСАН) і... гэта ўсё, — кажа яна. — Але Універсітэт трэцяга ўзросту працуе з людзьмі «пяцьдзясят пяць плюс». А што рабіць катэгорыі, якая толькі перасягнула 50-гадовую мяжу? Вось мы і будзем прапаноўваць ім свае паслугі. Ну і, улічваючы тое, што нам трэба плаціць за арэнду офіса і выкладчыкам, вядома, нашы курсы і гурткі будуць платнымі, але мы выстаўляем вельмі нізкія кошты. Напрыклад, тры рублі за адны заняткі — гэта нават ніжэй, чым у ТЦСАН.

Цэнтр сацыяльных праектаў плануе актыўна запусціцца з 1 кастрычніка. Тут прадугледжаны такія кірункі, як вывучэнне свайго радаводу, навучанне жывапісу і графіцы, рабоце з мабільнымі гаджэтамі і некаторыя іншыя. Але самае цікавае — усе гурткі будуць аб'яднаны ў адзіны клуб, галоўнай мэтай якога стане падрыхтоўка людзей да будучай пенсіі. Рабочая назва клуба — «Дадатковыя магчымасці 50+». І акрамя дадатковай адукацыі тут плануюцца заняткі з псіхолагамі, курсы дыеталогіі, фітнес... То-бок будзе і псіхалагічная падрыхтоўка да пенсіі, і падрыхтоўка ў плане клопату пра сваё здароўе, і нейкія матэрыяльныя аспекты жыцця на пенсіі тут таксама плануюць прапрацоўваць і рыхтаваць да іх.

— Чалавек, пасля таго як выйшаў на пенсію, адразу ж сутыкаецца з вялізнымі праблемамі, перш за ўсё псіхалагічнымі, — кажа Алена Кулюкіна. — Часцей за ўсё атрымліваецца так, што ён трапляе ў нейкі вакуум, пачынае адчуваць сябе нікому не патрэбным. Ён прывык усё жыццё працаваць, а цяпер сядзіць дома месяц-другі і пачынае разумець, што не ведае, куды сябе падзець. Так можна дайсці і да дэпрэсіі... Не будзе лішнім таксама падрыхтаваць людзей і да змены ўзроўню жыцця пры выхадзе на пенсію. І тут маецца на ўвазе не змірыцца з гэтым, а навучыць, як можна зарабіць дадатковыя грошы сваімі рукамі, нешта вырабляючы ці, напрыклад, фатаграфуючы.

У прыватнасці, Алена плануе вучыць размяшчэнню фатаграфій на стокавых сайтах.

«Чалавек, які займаецца фатаграфіяй, не абавязкова спецыяліст у гэтай галіне, але калі ён мае мінімальныя навыкі, мінімальную апаратуру і калі яму цікавая гэтая сфера, ён можа мець да сваёй пенсіі часам вельмі нядрэнную прыбаўку, — сцвярджае наша суразмоўніца. — Фатаграфаваць можна што пажадаеце, і калі размяшчаць гэтыя здымкі на пэўных замежных сайтах, то іх будуць купляць людзі і фірмы для сваіх мэт. Да разумення таго, што такі курс патрэбны, я прыйшла, калі пазнаёмілася з людзьмі, якія зарабляюць на гэтым грошы, прычым гэта не прафесійныя фатографы. Некаторыя пачалі займацца такой справай проста з адчаю, бо сутыкнуліся з цяжкай фінансавай сітуацыяй, таму што ў сям'і ёсць дзеці з інваліднасцю, напрыклад. І мне здаецца, што для катэгорыі «пяцьдзясят плюс» гэта таксама былі б вельмі карысныя веды і вопыт. Таму мы плануем вывучэнне фотамастацтва менавіта з камерцыйнага пункту гледжання: як зарабіць, маючы мінімальныя навыкі фатаграфавання. На іншых курсах плануем навучаць вырабляць цацкі, лапікаваму шыццю, вышыўцы стужкамі...

І ўсё ж, як упэўнена Алена Кулюкіна, самае галоўнае ў такім клубе, — стасункі. Гэта тое, чаго так не хапае ў адзначаным узросце, калі адбываецца пераацэнка каштоўнасцяў і сяброўскіх адносін, калі часта губляецца звыклы круг знаёмстваў, калі расчароўваюцца ў старых сябрах і часамі нават вырываюць з запісной кніжкі лісткі з іх прозвішчамі... Бо хочацца ўжо дарослай дружбы, а не тых сяброў-сябровак, якія цягнуцца яшчэ са школьна-інстытуцкага ўзросту і з якімі да гэтага часу ўжо можа не быць нічога агульнага. І вось у такіх клубах можна знайсці новых суразмоўнікаў і сяброў.

І ПРА ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ТУРЫЗМ...

Хочацца сказаць і яшчэ аб адным напрамку дзейнасці Цэнтра, які ўжо працуе. Гаворка ідзе пра інтэлектуальны турызм, зусім новае паняцце для 95 % беларусаў. Што такое турызм і адпачынак у звычайным уяўленні? Гэта мора і сонца, санаторый ці грыбы-ягады-дача. Або экскурсійная паездка з турфірмай: паглядзіце налева, а цяпер направа, а зараз пройдзем да музея...

— Я апошнім часам часта бываю сярод людзей, якія займаюцца сацыяльнай сферай, і бачу, што шмат каму цікава паглядзець на паспяховыя праекты, пераняць чужы вопыт і падзяліцца сваім, знайсці гранты, — расказвае Алена. — І наогул, шмат каму ёсць што сказаць аўдыторыі. Таму я ўжо некалькі гадоў займаюся інтэлектуальным турызмам: паездкамі на міжнародныя мерапрыемствы — канферэнцыі, форумы, кангрэсы. Прычым ездзім мы не ў якасці турыстаў або слухачоў, а ў якасці ўдзельнікаў і спікераў — дзелімся сваім досведам, выступаючы на міжнародных пляцоўках. Летась, напрыклад, ездзілі ў польскі Люблін на Кангрэс ініцыятыў Усходняй Еўропы і расказвалі там аб дадатковай адукацыі і рабоце беларускіх сацыяльных прадпрыемстваў, дзе працуюць людзі з інваліднасцю. Таму што на самай справе ў нас не ўсё так дрэнна: нам ёсць што расказаць і чым падзяліцца...

У верасні Алена зноў будзе на кангрэсе і ўскладае вялікія надзеі на гэтую паездку. «З намі паедзе шмат цікавых людзей, у асноўным прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў з розных канцоў краіны — з Віцебска, Баранавічаў, Ваўкавыска, Гомеля... — кажа яна. — Гэта некамерцыйны праект, мы проста ўзялі на сябе функцыю арганізатараў і каардынатараў зыходзячы з таго, што намі гэты шлях ужо пройдзены. Я — за актыўную дзейнасць. Калі ў чалавека ёсць мара, якую ён доўга выношвае, трэба абавязкова паспрабаваць яе ажыццявіць!»

Святлана БУСЬКО.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З днём нараджэння, Алесь Міхайлавіч!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наталля расказвае, што госці з задавальненнем налягалі на закускі, дачка з маці і стрыечнымі сёстрамі ледзь паспявалі мяняць талеркі. На 60-гадовы юбілей нават задзейнічалі два пакоі: у адным усе не ўмяшчаліся.

Афіцыйныя мерапрыемствы, прысвечаныя 50- і 60-гадоваму юбілеям пісьменніка, праходзілі ў сценах Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР, дзе пэўны час працаваў Адамовіч. А вось 60-гадовы юбілей Алесь Міхайлавіч адзначаў яшчэ і ў роднай Глушы. Наталля падзялілася адным з фота той падзеі.

— Я тады, на жаль, не паехала ў пасёлак, моцна захварэла, — прыгадвае яна. — У выніку прасядзела ўвесь дзень дома на тэлефоне — прымала віншаванні. Пазваніла, напэўна, чалавек 100 з усяго СССР. Плюс прымала тэлеграмы. Усе яны, дарэчы, захаваліся.

Падчас святкавання 60-гадовага юбілею ў Глушы.

Алеся Адамовіча няма з намі ўжо 24 гады. Але ў Глушы пра яго не забываюць. У гэты панядзелак адбыўся шэраг падзей, прысвечаных пісьменніку. Падрабязная праграма была размешчана на сайце Бабруйскага райвыканкама.

— Наш аддзел арганізаваў мерапрыемства ў пасялковым Доме культуры, — адзначыла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама Галіна ЧАРНОВА.** — Быў падрыхтаваны вечар памяці «Алесь Адамовіч — сведка вайны». Першым чынам усклалі кветкі да магілы Алеся Міхайлавіча. Потым наведвальнікаў запрасіла кніжная выстаўка «Алесь Адамовіч — праўда жыцця». Была арганізаваная літаратурная экспазіцыя «Апальваючая праўда вайны», якую правялі бібліятэчныя работнікі. Мерапрыемства скончылася паказам мастацкага фільма «Ідзі і глядзі», на які былі запрошаны прадстаўнікі ўлады, настаўнікі, старшакласнікі, усе жыхары пасёлка.

У Мінску, дарэчы, сёння таксама пройдзе мерапрыемства, прысвечанае Алесю Адамовічу.

— Мы знайшлі пляцоўку, дзе збяруцца прыхільнікі творчасці пісьменніка і кожны пачытае ўрывак з твора, які яму падабаецца, — адзначыў **арганізатар сустрэчы, ураджэнец Бабруйска Андрусь АРХІПЕНКА.** Сярод тых, хто плануе прыняць удзел у чытаннях, — тэлевядучая Зінаіда Бандарэнка, пісьменнік Уладзімір Арлоў, артыст Яўген Крыжаноўскі, які, дарэчы, сыграў эпізадычную ролю ў фільме «Ідзі і глядзі».

Работы над стварэннем музея ў Глушы, між тым, працягваюцца. Галіна Чарнова паведаміла, што двойчы за лета з Мінска паступалі грошы на рахунак, дзе акумулюецца сродкі на рамонт гістарычнага будынка аптэкі пад будучы музей. Але істотна на агульную суму яны не паўплывалі. Пакуль Бабруйскі райвыканкам прапрацоўвае альтэрнатыўны варыянт — стварэнне музейнай экспазіцыі, прысвечанай Алесю Адамовічу, у пасялковым Доме культуры. «У хуткім часе нам перададуць эскізы на зацвярджэнне, — удакладніла Галіна Чарнова. — Калі музей будзе гатовы, экспазіцыя перамесціцца туды».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Збор сродкаў на музей працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/с BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакументе абавязкова.